**Сільчанка, М.У. Ад князя і веча да Вялікага князя, Сейма і магдэбургскага права** / М. У. Сільчанка **//** Проблемы законности и правопорядка в Республике Беларусь / Материалы республиканской научно – практической конференции / Ред. колл.: А.А. Головко (главный редактор) и др. – Новополоцк: ПГУ, 2000. – С. 3 – 5.

---

Аналіз функцыянавання інстытута Веча ў дзяржавах - княствах, якія існавалі на тэрыторыі Беларусі ў X-XIII стст., а таксама ў Вялікім Ноўгарадзе, Пскове, Кіеве, іншых гарадах дазваляе сцвярджаць, што інстытут Веча меў «падвоеную» прыроду. З аднаго боку, Веча дзейнічала як класічны орган дзяржавы, які меў шырокія ўладныя паўнамоцтвы: вырашэнне пытанняў вайны і міру, заканадаўства, заключэння дагавароў, ажыццяўлення правасуддзя па палітычных і іншых злачынствах. З другога боку, Веча захоўвала «класічныя» элементы самакіравання, якія былі ўласцівы рода-пляменнай арганізацыі ўлады першабытнага грамадства. І ў гэтым няма нічога дзіўнага, калі мець на ўвазе, што інстытут Веча ў дзяржавах - княствах X-XIII ст.ст. з'яўляецца нашчадкам вечавага ладу славян, які існаваў у іх з незапамятных часоў.

Княжацкая ўлада, якую ўсходнія славяне ўвялі ў сябе шляхам «запрашэння» варагаў на княжанне, сталася класічнай праявай дзяржаўна - арганізаванага грамадства. Натуральна, князі, якія ўвасаблялі дзяржаўнасць, імкнуліся сканцэнтраваць у сваіх руках як мага болей уладных паўнамоцтваў. А паколькі раней, пры рода - пляменным ладзе суб'ектамі ўлады былі агульны сход суродзічаў і яго прадстаўнік – Веча, князі вымушаны былі абапірацца на нейкую з гэтых сілаў, каб завалодаць паўнамоцтвамі другой. Найбольш слабым было Веча, паколькі яго паўнамоцтвы былі вытворнымі ад паўнамоцтваў агульнага схода суродзічаў. Менавіта супраць Веча і былі скіраваны першыя ж удары княжацкай улады, вынікам якіх стаўся паступовы пераход вечавых уладных паўнамоцтваў да князя і амаль поўнае знікненне інстытута Веча з гістарычных падмосткаў. Вось чаму ў першых славянскіх летапісах, іншых крыніцах асноўным суб'ектам дзяржаўнага і прававога ўладкавання выступаюць князь і яго дружына.

Разам з тым, пасля фактычнага знікнення Веча з палітычнага небасхілу, княжацкая ўлада засталася сам - насам з арганізаваным у дзяржаву народам, які, безумоўна, імкнуўся захаваць за сабой старыя, ад веку дадзеныя правы і вольнасці. Вось чаму ў летапісах, дзе паведамляецца аб заключэнні дагавораў славян з князямі - варагамі, мы знаходзім палажэнні, умовы, якія вылучалі славяне запрошаным князям, кшталту «а старыны не рушити…». Але – марна і дарэмна!!! Адна з заканамернасцей існавання і функцыянавання дзяржаўнай улады якраз і зводзіцца да таго, што дзяржава заўседы імкнецца пашырыць межы сваіх уладных паўнамоцтваў. І вось пасля таго, як славянскае насельніцтва першасных даяржаўных утварэнняў наўпрасткі сутыкнулася з дзяржаўным Левіяфанам і вымушана было бараніць свае адвечныя правы і вольнасці, яно ўспомніла і вярнула вядомы інстытут Веча. Такім чынам, адбылася «рэанімацыя» гэтага інстытута. Натуральна, ва ўмовах дзяржаўна - арганізаванага грамадства адбылося напаўненне дадзенага інстытута новым зместам.

Веча вярнула сабе, а, дакладней, «адабрала» ад князя частку яго ўладных паўнамоцтваў у сферы дзяржаўнага будаўніцтва, законатворчасці, ажыццяўлення правасуддзя і г.д. У многіх гарадах (Вялікі Ноўгарад, Пскоў) Веча пачало выбіраць службовых асобаў – пасаднікаў, тысяцкіх і інш., – якія сталі кантраляваць дзейнасць князя. Больш таго, частку сваіх уладных паўнамоцтваў, напрыклад, у Вялікім Ноўгарадзе, князь мог рэалізаваць толькі пасля згоды на гэта пасадніка і тысяцкага.

Рэанімаванае Веча за ўвесь час свайго існавання ва ўмовах дзяржаўна -

арганізаванага грамадства так і не пераўтварылася выключна ў орган дзяржавы. Справа ўся ў тым, што паўнамоцтвы Веча ніколі не былі акрэслены дакладна і аднастайна. Яны то пашыраліся за кошт уладных паўнамоцтваў князя, то звужаліся, калі княжацкая ўлада ў залежнасці ад абставін знешняга ды ўнутранага характару «перацягвала» да сябе частку дзяржаўна-ўладных паўнамоцтваў Веча. Але Веча вырашала шмат іншых пытанняў жыццядзейнасці нашых продкаў, якія не мелі дзяржаўна-прававой прыроды, а тычыліся выключна ўнутраных пытанняў славянскай абшчыны і забяспечваліся традыцыйнымі «абшчыннымі» метадамі і сродкамі, фінансаваліся не з дзяржаўнай казны, а шляхам аб'яднання матэрыяльна-фінансавых рэсурсаў абшчыннікаў. Гэта рамонт і пабудова новых дарог, мастоў, іншых месцаў і сродкаў агульнага карыстання, гандлёвыя справы і г.д. Менавіта пры вырашэнні гэтых пытанняў Веча і дзейнічала як орган самакіравання. Аб'ём «самакіраўнічых» пачаткаў у дзейнасці Веча залежаў ад асаблівасцяў развіцця той ці іншай зямлі, таго ці іншага горада.

Такім чынам, Веча ва ўмовах дзяржаўна-арганізаванага грамадства было своеасаблівым «водападзелам» паміж дзяржаўнымі і самакіраўнічымі пачаткамі. Зразумела, што доўга так працягвацца не магло.

Развіцце дзяржавы на беларускіх землях з XIII ст. ішло ў кірунку ўзбуйнення асобных дзяржаваў - земляў і фармавання адзінай цэнтралізаванай дзяржавы. Працэс стварэння Вялікага княства Літоўскага суправаджаўся станаўленнем вялікакняжацкай улады, якая па аб'ему, характару сваіх уладных паўнамоцтваў амаль нічым не адрознівалася ад улады князёў у дзяржавах-землях, але распаўсюджвалася на большую тэрыторыю, што ўключала ў сябе тэрыторыю былых дзяржаваў - земляў.

Разам з фармаваннем цэнтралізаванай дзяржавы і станаўленнем вялікакняжацкай улады трансфармуецца і Веча – прадстаўнічы орган супольнасці. У адзінай цэнтралізаванай дзяржаве на месцы і замест Веча асобных дзяржаваў - земляў фармуецца і адзіны прадстаўнічы орган улады для ўсей дзяржавы – Сейм, да якога пераходзяць усе Вечавыя ўладныя паўнамоцтвы дзяржаўна - прававога характару (законатворчасць, правасуддзе і г.д.) асобных дзяржаваў - княстваў.

Натуральна, са знікненнем Веча ў асобных гарадах не знікаюць тыя справы (функцыі) самакіраўнічага характару, якія яно ажыццяўляла. Справы засталіся, але адпаведных структурных інстытутаў (устаноў), якія б іх выконвалі, не было. Утварыўся своеасаблівы «вакуум» уладных структураў на мясцовым узроўні. Ен мог быць запоўнены альбо ўстановамі дзяржаўна - прававога характару, альбо органамі мясцовага самакіравання, якія павінны былі быць сфармаваны мясцовымі супольнасцямі - абшчынамі. Вялікакняжацкая ўлада задаволіся тым, што атрымала магчымасць прызначаць на мясцовым узроўні сваіх прадстаўнікоў – ваяводаў, старастаў, войтаў і г.д. , якія валодалі значнымі паўнамоцтвамі і ўвасаблялі ў жыцце агульнадзяржаўныя інтарэсы. А мясцовыя супольнасці - абшчыны атрымалі магдэбургскае права.

Сказанае дазваляе зрабіць выснову аб тым, што ўвядзенне магдэбургскага права на Беларусі не было простым запазычаннем замежных прававых узораў, бо права на самакіраванне было сталай традыцыяй нашых продкаў. Магдэбургскае ж права дапамагло дакладна акрэсліць гэта права ў якасці асобнага інстытута ў прававой сістэме Вялікага княства Літоўскага, сфарміраваць сістэму прадстаўнічых, выканаўчых і судовых органаў мясцовага самакіравання, размежаваць іх кампетэнцыю і стварыць належную матэрыяльна-фінансавую базу дзейнасці, усталяваць трывалыя прававыя сувязі вялікакняжацкай улады і мясцовага самакіравання, дакладна акрэсліць іх узаемныя правы і абавязкі.